САМАПОМАЧ
SAMAPOMAČ

Беларуская коопэратыўна-гаспадарчая часопісь

Год II. | Вільня, Студзень 1933 г. | № 1(4).


Хай злыдні над намі
скрыпочуць зубамі,
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапомаччу.

Джордж РЭССЭЛЬ.
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 1 (4).

BIEŁARUSKAJA ABECEDA.

Беларуская абэцэда.

A, a — А, а,	H, h — Г, г.	Ł ł, — Л, л.	Š, š — Ш, ш.
B, b — Б, б.	Ch, ch — Х, х.	M, m — М, м.	T, t — Т, т.
C, c — Ц, ц.	I, i — І, і.	N, n — Н, н.	U, u — У у.
Ć, ć — ЦЬ, ць.	J, j — Й, й.	Ń, ń — НЬ, нь.	Ŭ, ŭ — Ў, ў.
Č, č — Ч, ч.	Ja, ja — Я, я.	O, o — О, о.	V, v — В, в.
D, d, — Д, д.	Je, je — Е, е.	P, p — П, п.	Y, y — Ы, ы.
E, e — Э, э.	Ju, ju — Ю, ю	R, r — Р, р.	Z, z — З, з.
F, f — Ф, ф.	K, k — К, к	S, s — С, с	Ž, ž — Ж, ж.
G, g — Г, г.	L, l — ЛЬ, ль.	Ś, ś — СЬ, сь.	Ź ź — ЗЬ, зь.

Samapomač

BIEŁARUSKAJA KOOPERATYŪNA - HASPADARČAJA ČASOPIŚ.

Adres:
VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 4—10.

Самапомач

Hod II.	Vilnia, Studzień 1933 h.	Nr 1 (4).

Kooperacyja pad abstrełam.

(*Zamiest Novahodniaha*).

Histaryčnaje kalaso hetak pakruciłasia, što 2,5 miljony biełarusaŭ musiać siahońnia supolna pieražyvać usie biedy, žudaści i ciažary polskaha pracoŭnaha nasielnictva, čaho nielha skazać ab faktyčna supolnym karystańni z poŭnaści pravoŭ. Hetkaj biadoj, kali nie nazvać jaje prosta soramam prad sučasnaściu, a tymbolš — historyjaj, jošć niaviedama dakładna jašče hdzie zrodžany p r a j e k t uradavaha nadzoru i kantroli nad kooperacyjaj. Na inšym miejscy hetaha numaru „Samapomačy" havorycca ab kulturna-aśvietnaj pracy, haspadarčaj samadziejnaści i palityčnaj neŭtralnaści kooperacyi, jak asnaŭnych varunkach (Rochdale!) jejnaha rožvitku i karyści. Tymčasam, što-ž my bačam u kooperatyŭnym žyćci siańniašniaj Polščy? —

Jašče nia viedamy ŭsie naśledki, da jakich daviadzie kooperacyju ŭ Polščy prezydenskaje razparadžeńnie — z mocaj ustavy — ab tavarystvach z d. 27.X.32 h., jakoje hetak ahraničvaje kooperacyju ŭ volnym budavańni jaje asnovaŭ pry pomačy kulturna-aśvietnaj pracy, jak blizkija da spravy čyńniki ŭznoŭ nakazvajuć ab čarniejšych jašče chmarach, što z novym hodam zavałakli i biez taho niepahodny ŭžo kooperatyŭny kruhazor u Polščy. Sprava hetym razam na hetulki niebiaśpiečniejšaja, što b'je kooperacyju nie rykašetam (adbojem) tolki, ale prosta, z frontu dy ŭ samaje serca i mazhi, u haspadarčuju samadziejnaść kooperacyi i jejnuju niezaležnaść ad čyńnikaŭ palityčnych. Kankretna sprava pradstaŭlajecca hetak:

Dahetul abaviazyvajučaja polskaja ŭstava ab kooperatyvach z 1920-23 h. h. stałasia niekamu za vuzkaja — ci za šyrokaja — usio roŭna. Dość taho, što ŭ najvyšejšaj kantrolnaj ustanovie dla kooperacyi, u Kooperatyŭnaj Radzie — siabrami katoraj u ²/₈ źjaŭlajucca pradstaŭniki paasobnych kooperatyŭnych revizyjnych sajuzaŭ, a staršynioj jošć naznačany čynoŭnik Ministerstva skarbu — źjaviŭsia prajekt źmieny dahetulašniaj ustavy ŭ tym sensie, što ŭsia dziejnaść kooperatyvaŭ faktyčna pazbaŭlajecca sobskaj inicyjatyvy, siły i voli pracy dy pierachodzić pad nadzor i kamandu Ministerstva skarbu, ustanovy biurokratyčnaj i naskroś palityčnaj. Da aŭtorstva całaści hetaha prajektu tymčasam nichto nie pryznajecca. Ale toj fakt, što z im u Kooperatyŭnaj Radzie vystupiŭ jejny staršynia, faktyčna — ministerski čynoŭnik a znača — čałaviek hetamu ministerstvu pad uładny, — pazvalaje dumać, što za hetym prajektam źmieny ŭ pradstaŭlenaj formie staić samo Ministerstva skarbu, a za im i cełу urad. A ŭ hetym i ŭvieś sens.

Nia majem namieru, ani mahčymaści zajmacca tut hetym prajektam źmieny kooperatyŭnaha zakonu ŭ całaści. Zaznačyć musim tolki ahulnuju tendencyju prajektadaŭca „ŭziać na mušku" revizyjnyja sajuzy kooperatyvaŭ, jak arhanizacyjna-prapahacyjnyja asiarodki samadziejnaha kooperatyŭnaha žyćcia. Mova ab hetym u § 68 prajektavanaha zakonu, pavodle jakoha Kooperatyŭnaja Rada faktyčna stajecca tolki paravanam, z-za katoraha prosta ci pasiaredna—praz staršyniu Rady — usiej kooperacyjaj, instytucyjaj hramadzkaj, kiravacimie ruka Ministra skarbu: ministr — a nia Rada, jak dahetul — pryznaje Kooperatyŭnym Sajuzam prava revizii, ministr heta prawa adbiraje — navat biez prasłuchańnia abvinavačanaha Sajuzu, jak było dahetul, — ministr „moža žadać ad Sajuzu ahraničeńnia abšaru jahonaj dziejnaści, — słuchajcie! — zvužvańnia abo rašyreńnia hetaj-ža dziejnaści na peŭnyja typy kooperatyvaŭ, moža taksama zahadać złučycca dvum ci bolš sajuzam u adzin sajuz". — Kudy ŭsio heta moža zaviaści?

Hetaha adnak jašče mała. Prajekt uspomnienaha zakonu, što hetak viaža kooperatyvy, ale nie konkretyzuje, kali imienna i zašto suproć ich moža ministerstva vystupić i prarvać afiarnuju hramadzkuju pracu, — hety prajekt pradbača jašče na im užo abasnovanyja ministerskija nakazy („zarządzenia"), katoryja, peŭnie-ž, nie dla taho buduć pisacca i vydavacca, kab isnujučuju „apieku" pamienšyć.

Jak usio heta moža vyhladać u praktyčnym žyćci, — u padrobnaściach pradbačyć nielha. Peŭnymi zdajucca być zatoje dva punkty: 1. dla ŭsich kooperatyvaŭ biaz vyniatku nia hetak dasca ŭ znaki „boh", jak „bažaniaty" i 2. najbolš adčujuć na sabie prajektavanuju „apieku" kooperatyvy niapolskija — złyja jazyki kažuć, što prajekt „apieki" specyjalna dla ich i skrojeny, — a miž imi chiba-ž u pieršuju čarhu niesarhanizavanyja jšče dosyć kooperatyvy biełaruskija.

DANIŁA LICHARD
(1882—1932).

U minułym hodzie spoŭniłasia 50 hod ad času śmierci pačynalnika słavackaj kooperacyi Daniły Licharda. Hetyja ŭhodki ŭdziačnyja słavaki, biaz rožnicy pierakanańniaŭ, abchodzili vielmi ŭračysta, a m. Skalica Słavackaja, hdzie Jubilat najdaŭžej pracavaŭ, stavič jamu cenny pamiatnik. — Chto-ž taki byŭ D. Lichard?

Byŭ heta skromny słavacki evanhielicki duchoŭnik, jaki pry vykonvańni svaich dušpastyrskich abaviazkaŭ mieŭ mahčymaść dobra paznać patreby svajho narodu nia tolki duchovyja, ale i materyjalnyja. Hłybokaje-ž i sapraŭdy chryścijanskaje sumleńnie D. Licharda nie pazvalała jamu suproć bačanaha i pieražyvanaha astavacca biazčynnym. I D. Lichard staŭsia sapraŭdy apostałam lepšaj budučyni svajho narodu, nia raz suproć voli čužoj pa kryvi ŭłady, duchoŭnaj i śvieckaj, bo razumieŭ, što ŭsio mianiajecca, ale narod tryvaje viečna.

Čynnaść Licharda była pieradusim piśmieńnickaja i pačałasia ad napisańnia i vydańnia knihi-kalendara ab kredytovaj kooperacyi p. n. „Damovaja Kasa“, jašče ŭ 1847 h. U nastupnych hadoch D. Lichard byŭ pa čarzie redaktaram piacioch słavackich kooperatyŭna-haspadarčych časopisiaŭ i dalej pracavaŭ pieravažna ŭ tej-ža kooperacyi kredytovaj. Pamior D. Lichard na 70-tym hodzie svajho pracavitaha žyćcia, u 1882 h., pakidajučy pa sabie ŭspamin nia tolki duchoŭnika-chryścijanina, ale i sapraŭdnaha hramadzianina.

Kłoniačy hałavu prad pamiaćciu i zasłuhami dastojnaha syna słavackaha narodu, nia možam nie pažadać, kab i pa našych biełaruskich siołach jak najbolš i jakna chutčaj množylisia rady duchoŭnikaŭ-hramadzian, jakija, staroniačysia dačasnych skarbaŭ i vyhodaŭ z čužych, nie zaŭsiody pryjacielskich ruk, žbirali sabie zapłatu ŭ svaim ža biełaruskim narodzie, jaho ad napaściaŭ baranili, u biadzie pamahali, da śviatła praŭdzivaj navuki viali i vierna jamu słužyli!

Narod dla synoŭ svaich daŭžnikom nia byvaje, ale sudździoju — tak: kab ža nia byŭ hety sud u nas za srohi! RED.

Dla kooperacyi stvarajecca takim čynam ciažkaje pałažeńnie; ciažkaje, ale niebiazvychadnaje. Apora jšče jość i patryvaje tak doŭha, „pokul buduć ludzi“, što siłu i istotu praŭdzivaj kooperacyi razumiejuć. Suproć hetaj śviedamaści biazmocna ŭsio na śviecie. Dziela hetaha — niezaležna ad taho, ci prajekt staniecca zakonam, ci nie — najlepšaj abaronaj suproć usiakich nastupaŭ na istotu kooperacyi jość kooperatyŭnaje ŭśviedamleńnie i dziejnaje ŭ hetych kooperatyvach arhanizavańnie. Nie pieramožanymi tady budziem, a pieramožnikami.

Я. Косаўскі.

(4)

Для бліжніх.

Драма ў 4-ох дзеях.

(З украінскай на беларускую мову тлумачыла Г. Ш.)

ЗЬЯВА 4.

Ахрэм (*стукае кладкай*): Ты чаму, Аляксей, баішся падыйсьці да нашага хутара?

Аляксей (*цалуе яго ў руку*): Ды не, дзядуля, я так...—Толькі што трохі адпачыў...

Ахрэм: А мы з Насьцяй чакаем, а цябе як няма, так няма. Кажа Насьця: „Ідзі, дзедка, паглядзі, можа ён яшчэ ёсьць на сенажаці“. Выйшаў я за вароты, гляджу, аж тут тарчыць нешта над ракою перад месяцам... Ну, і што-ж? Дакуль ты думаеш на нас гневацца?! Га? — Ворагі мы вам вялікія, праўда? На зло матку стары Ахрэм нагаварываў?

Аляксей: Дзядуля, ды я гэтаму не вінаваты.

Ахрэм: Дзед вораг, бо добра радзіў. Не паслухала дзеда, а цяпер што?... Знаю, знаю ўжо, што ў вас робіцца. Прайдзісьвет — прайдзісьветам. Хацела маці гаспадара, а цяпер, яшчэ мусіць яго пільнаваць, каб ня выносіў да Янкеля што-папала. Калі-б устаў нябожчык, ды паглядзеў, як маці ўстроіла ўсё па яго сьмерці, то йзноў-бы лёг у сырую зямлю. Эх, лёгкадушная яна, лёгкадумная... Ды найбольш мне цябе, Аляксей, шкада і гэтых малых дзяцей. Я й сам цяпер шкадую, што тады пры табе на матку накрычаў, а ты сабе так моцна ўзяў гэта да сэрца, што забыў да нас і сьцежку. А можа й матка забараніла?... Ды вось, бачыш, я тыкі ня вытрываў. Паслаў па цябе, а ўрэшце і сам прыйшоў. Бачыў цябе ўдзень паміж касцамі, думаў, што можа прыйдзеш.

Аляксей: Выбачце! Я й сам ня знаю, чаму я так. Я ніколі аб Вас дрэннага ня думаў, але думаў, што Вы загневаліся, ды не патрабуеце, каб я да Вас прыходзіў.

Ахрэм: А Насьця, дык усё цябе ўспамінае. Няраз просіць: „Пайдзеце, дзедку, перапрасеце іх“.

Аляксей: Дзякую Вам! І я ў думках заўсяды Вас успамінаю. Шкада мне было, ды што-ж рабіць...

Ахрэм: Ну, нічога, нічога! Прыходзі да нас, як і раней прыходзіў. А Насьця нядзелямі такія прыгожыя кніжкі чытае... А як там у Вас дома?... „Вяснуеце“? Цяжка?...

Аляксей: Неяк даём раду. Хлеба сё-

Kali Boh nie dapuścić, to ś.... nia źješć. - n. pr.

Novy Rochdale.

Historyja — kažuć — paŭtarajecca. Haspadarčy śviet, a pieradusim śviet kooperatyŭny z dzivam sočyć siahońnia za roźvitkam novaha Rochdala (čytaj — ročdel). Ale biełaruskamu čytaču cikava chiba budzie daviedacca pierš, što takoje Rochdale „stary", abo prosta Rochdale? — Voś-ža Rochdale — nievialičkaje miesta ŭ paŭnočnaj Anhlii, heta kałyska kooperatyŭnaha ruchu. Tam bo 80 hod tamu nazad, u 1843 h., biezrabotnyja tkačy ŭradzili, što supolna buduć praz hod źbirać drobnyja aščadnaści, adčyniać za hetyja hrošy sobskuju kramu, buduć u joj usie i ŭsio kuplać. Z hetaha źbierycca ŭ kramie kapitał, jaki nia buduć dzialić, ale za jaho adčyniać svaje fabryki, svaje majsterni, svaje škoły...

Minuŭ hod. 28 tkačoŭ, u hetym adna kabieta, datrymali danaha sabie słova, syšlisia ŭznoŭ, złažyli „z nosu pa hrošu" — 28 libraŭ*) i 21 śniežnia 1844 h., u domie pry zahłochłaj vulicy, što nazyvałasia „Łabi kutok", adčynili svaju kramu, u katoraj mieli na prodaž tolki: masła, cukar, muku, aŭsianyja krupy i śviečki — usiaho tavaru na 14 libraŭ. Kab było mienš razchodaŭ, uhavarylisia, što na pačatak, krama budzie adčynienaj tolki dva razy ŭ tydzień, dy i to na paru viačernich tolki hadzin. — Pomačy ad nikoha, navat ad uradu, nie chacieli: prasili tolki, **kab im nichto nie pieraškadžaŭ**. Pastanavili pry hetym: paspłacić svaje daŭhi, nia kuplać ničoha na pavier, usio kuplać u svajoj tolki kramie, čaść nadvyški, kali buduć dzialić, dyk nie pavodle taho, chto jakuju złažyŭ składku (paj), ale pavodle taho, chto kolki ŭ kramie za hod nakuplaŭ...

Čas išoŭ. Na vośmym hodzie pačcivaj pracy kooperatyva mieła ŭžo svoj młyn, svaje kravieckija i šavieckija majsterni. Na dvaccatym hodzie — sarhanizavała svaju bojniu i pabudavała sabie vializarny, bo trypavierchavy dom dla prymiaščeńnia ŭsich svaich kramaŭ, kancelaryjaŭ, majsterniaŭ, čytalni, biblijateki, t-va dabravolnaj strachoŭki, kasy aščadnaści i addziełu budovy damoŭ na vypłatu, jakich pabudavana nad piaćsot. Da taho pabudavana była jšče svaja piakarnia, tabačnaja fabryka, kooperatyŭnaja tkalnia na 96 stankoŭ, paśla druhaja, pradzielnia dy fabryka papiery...

Pry ŭsich hetych zdabytkach charaktaru haspadarčaha, ročdelcy nie zabyvalisia i ab aśviecie, bo viedali, što praca haspadarčaja, biez pracy aśvietnaj, raniej ci paźniej musić załamacca. Dziela hetaha było pryniata, što ŭsie kooperatyvy buduć kožny hod adkładać pa $2^1/_2$ prac. hadavoj nadvyški na pracu praśvietnuju. I hety krok ročdelcaŭ, pobač z inšymi ŭžo ŭspomnienymi, byŭ mocnaj padstavaj dalšaha roźvitku kooperacyi....

*) libra — heta nazoŭ anhlijskich hrašej. U to čas heta raŭniałasia pryblizna 10 rublom.

лета было помала, але да новага перабудзем, толькі адна бяда...

Ахрэм: З п'яніцаю?... О, ведаў я, ведаў, што так будзе. Ды пацярпеце трохі, можа знойдзецца на гэта якая рада. Калі-б гэта бацькаўшчына... Ой, бяда з такім айчымам.

Аляксей: Тата мне часта сьніцца. Ды ўсё такі сумны. У падзёртай вопратцы.

Ахрэм: Няхай Госпад гасьціць яго ў сябе. Добры быў чалавек. — (*Памаўчаўшы*): Мне Насьця казала, што зьбіраецеся залажыць краму. Неяк так дзіўна завецца... каб усе на яе грошы злажылі і ўсе да яе мелі права...

Аляксей: А так, закладаем коопэратыву.

Ахрэм: О, дужа добрая і карысная справа. Памагай Вам Бог! І я туды дам нейкі паёк. Ужо досыць Янкель напіўся нашай крыві. Бачыш, як збагацеў.

Аляксей: Калі-б так людзі зразумелі, дык гэтага ліхвяра за месяц ня было-б у сяле.

Ахрэм: А, пара ўжо, пара завясьці нейкі парадак у вёсцы. Колькі пакражаў праз гэту карчму, а сьлёз, а гора... — Бярэцеся Вы, маладыя! І я памог-бы Вам, ды ўжо сілы ня маю, ды і чытаць не змагу, бо ўжо добра ня бачу. Тады!...

Аляксей: Вось, каб такіх было больш, як Вы, дзедка!... Ды дасьць Бог, што з часам усе зразумеюць... —

Ахрэм: Так, так, добрая і разумная справа! Яшчэ як твой бацька жыў, вось дык ён да гэтай справы быў гарачы. І ты ў яго ўдаўся.

Насьця (*нліча з хутара*): Дзядуля, дзядуля, хадзеце вячэраць. (*Голас чуваць што раз бліжэй*): Дзядуля-а-а. Хадзеце вячэраць.

ЗЬЯВА 5.

(*Прыходзе Насьця*).

Ахрэм: Чаго ты так крычыш? Я йшчэ, дзякаваць Богу, добра чую.

Насьця: Добры вечар, Аляксейка! Чаму да нас ня прыйдзеш? У нас-жа лепш пагаварыць, чым тут над ракою.

Аляксей: Некалі другім разам. Сяньня пара ўжо дамоў. Позна.

Насьця: Заўтра сьвята. (*Да Ахрэма*): А там Трахім ня ведае, куды вясьці коні, ці за рэчку на скошанае, ці за садам наважаць...

Ахрэм: Пайду, ды распараджуся. А ты, Аляксей, прыхадзі да нас. Ня блудзі, ды ня мінай нас! А пра гэну абяцанку, што я табе даў, забыўся?... Я сам мусіў даглядаць. Ужо дзесяць пнёў маеш. Вось заўтра, пры сьвяце прыйдзеш, дык паглядзімо. Ужо й некалькі раёў было ў мяне. Прыйдзі заўтра, прыйдзі!..

Аляксей (*радасна*): Прыйду, дзедку, прыйду.

Ахрэм: А матцы скажы, няхай ня гне-

Dla poŭnaha zrazumieńnia tahačasnych varunkaŭ žyćcia i pracy treba zaciemić, što byŭ heta čas. kali pošaść biezraboćcia — i inšyja haspadarčyja biedy — ŭsie kruhom spadziavalisia vylačyć pieramienami i pracaj palityčnaj, hdzie ŭznoŭ najmodniejšym byŭ radykalizm partyi hetak zvanych „čartystaŭ“. — Voś-ža, ročdelskija pačynalniki kooperacyi, choć sami asobna i mahli zajmacca palitykaj, to adnak z pracy kooperatyŭnaj palityku susiom vyłučyli, bo ŭvažali, što ad haspadarčaj biady treba ratavacca pieradusim pracaj taksama haspadarčaj. Žyćcio pakazała, što ročdelcy razvažali pravidłova...

Minuła 80 hadoŭ. Na śviecie paŭtaryłasia biada jšče bolšaja. Pošaść biezraboćcia abniała niačuvanyja dahetul raźmiery. Adny tolki Spałučanyja Štaty (Dziaržavy) Paŭnočnaj Ameryki majuć siahońnia 10 miljonaŭ biezrabotnych. Ameryka strachoŭki nia znaje, a dabradziejnaść, pry hetkich raźmierach niaščaścia, sama saboj spravicca nia moža. Palityčnyja kroki nie dajuć biezrabotnym nijakich vidokaŭ na papravu. I pry hetkich voś umovach, biezrabotnyja žychary partovaha miesta Seattle (čytaj — sitl) u štacie Vašyngton, hod tamu nazad pastanavili, što niečaha im čakać na dapamohu ci to ŭradu ci publičnaj dabradziejnaści, dy što moža im pamahčy tolki... samapomač.

Z hetaj metaj jany zasnavali „Lihu biezrabotnych“, kudy adrazu zapisałasia 40.000 siabraŭ.

Što-ž heta „Liha“ robić?— U vakolicach Seattle šmat lasoŭ, rybnaje mora — tu-ž, bahatyja pali — taksama. Ale niama kupcoŭ na dreva, rybnyja kanservy hnijuć na składach, bulba — na paloch, a biezrabotnyja... pochnuć ad hoładu. I što robiać biezrabotnyja seattleŭcy?— A voś: dastaŭšy łodki jany pačali na svoj rachunak łavić rybu. Ułaśniki niesabranaj z pola bulby addali jaje biezrabotnym darma, z varunkam tolki, što tyja vybierać hetu bulbu da čysta. Ułaśniki lasoŭ addali na vyrubku peŭnuju čaść lesu. Znašlisia achviaradaŭcy pavoznaj siły, kab usio heta źviaźci. A jak heta stałasia, było čym abahnać hoład, byli puščany ŭ chod ramiesnyja majsterni: šaŭcoŭ, kraŭcoŭ, stalarni, ślasarni i h. d. Pačaŭsia abmien vyrablenych tavaraŭ, tolki nie na hrošy, a naturaj: chočaš dastać abutak, vopratku, zamok? — niasi „chleba i da chleba“. Pačałosia novaje žyćcio, žyćcio biez hrašej, žyćcio zamieny pracy... Susiednija z Seattle miesty pačali rabić toje samaje. A viasnoj min. 1932 h. byŭ užo sklikany ŭ Vašyngton Kanhres Federacyi Lihi Biezrabotnych, jaki pryniaŭ dźvie pastanovy: ab uviadzieńni zamiennaj systemy pamiž vioskaj i miestam i ab nieŭvachodžańni Federacyi ni z kim u zmovy palityčnyja.

Ab dalšym losie amerykanskich pačynal-

ваецца, ды вельмі не бядуе... Можа яно йшчэ як... (*Пайшоў. Нейкі час Аляксей і Насьця стаяць моўчкі*).

Насьця: Аляксейка! Чаму ты такі задуманы? Як ты зьмяніўся за той час. Раней заўсёды быў вясёлы, а цяпер толькі думаеш, зьвесіўшы галаву.

Аляксей: Запытайся дзеда!

Насьця: Гэта ўжо было даўно. А колькі разоў я прасіла цябе, каб ты прыходзіў да нас, а ты нават не адазваўся. Нядобры ты для мяне. Помніш, як калісь было?

Аляксей: Тады мы йшчэ дурненькія былі.

Насьця: Але якія шчасьлівыя! Памятаеш, як ты мне кніжачкі прыносіў, як я ўчылася, як плакала, як ты чытаў „Кабзара“... — Добра, ох, як тады было добра. Бывала ў пасеку зойдзем... Пчолы зьвіняць... рай на зямлі, казаў ты... і пацямнеў пасьля той рай. Няраз выйду я цяпер туды, дзе мы абое чыталі і паплачу, ды так, што ніхто ня бачыць... А ты старонішся ад мяне, нехаця да мяне якое слова скажаш. Я й сама ня знаю, што табе зрабілася. (*Падыходзе бліжэй*) Аляксейка, брацейка! Скажы мне: у цябе якоесь гора на душы? Чаго? Скажы! Можа я табе параджу?

Аляксей: Ня ведаю, Настачка, чаго ты ад мяне хочаш. Ты-ж знаеш, што досыць ужо забаўкамі жыць. Што год, то жыцьцё становіцца цяжэйшым.

Насьця: А можа ты закахаўся?... А скажы, скажы, якая яна, сьветлавалосая ці цёмнавалосая? Жаніцца пэўна задумаў?... Так, так, гэтульki часу — тры гады... Я й забылася... Усяляк магло сэрца перарадзіцца... Што калісь было, забылася...

Аляксей: Ты толькі насьмяхаешся з мяне, Насьця.

Насьця: Не насьмяхалася я ніколі, а кажу праўду. Калісь ты быў іншы і я цешылася пры табе. Зьмяніўся ты і мне сьвет пацямнеў. Жыла я гэтыя тры гады тым, што раней пражыла з табою. Ты быў для мяне братам... Не! Больш, як братам... Найбліжэйшым з усіх людзей... Аж пасьля штось з табой сталася... Ня веру ў тое, каб народная праца забрала ў цябе ўсё на векі. Ты вернешся назад, праўда, мілы... Ты знаеш, як калісь казаў ты, прысягаў? — а цяпер чаму так?...

Аляксей: Настачка, рвеш ты маё сэрца і душу на двое. Многа, вельмі многа хацелася-б табе сказаць, пагаварыць з табою, я ўсё думаў, што ты мяне забудзеш... Ты-ж казала, што мы брат і сястра.

Насьця: Тагды мы былі сястрою і братам.

Аляксей: І далей гэтак будзем, Настачка.

Насьця: Зводзіш ты мяне. Каб я цябе забылася? Я ня тая вось травіца, што ты сяньня скасіў, а заўтра яна зьвяне, забудзец-

Praca ŭ niamieckich spažyvieckich kooperatyvach.

(2) Kooperacyja ŭ Niamieččynie maje tuju asablivaść, što ŭsimi sposabami starajecca materyjalna zacikavić svaich pajščykaŭ. Hetak, naprykład, u mnohich kooperatyvach, paśla taho, jak siabra zapłaciŭ užo svoj pajevy ŭznos, — premija zaličvajecca (za zhodaju pajščyka) na budaŭlany fond, katory, u svaju čarhu, kładzie padstavy da stvareńnia budaŭlanaje kooperatyvy. —

Šyraka raspaŭsiudžana ŭ Niamieččynie taksama vydača zapamohaŭ na vypadak śmierci siabry kooperatyvy ci-to kaho-niebudź z jaho siam'i. Zapamoha hetaja vydajecca jak biezzvarotnaja i raźmier jaje, jak napr. u Essenie, ustanoŭleny ŭ 25 marak dla dziciaci i 100 marak dla darosłaha.

U Hamburskaj kooperatyvie arhanizavany asobny fond na vypadak ciažkaj patreby. Jon tvorycca z adličak ad naležačych pajščyku premijaŭ za nabor, pry čym raźmier siabroŭskaha ŭznosu ŭ hety fond ustanoŭleny na 100 marak.

Fond hety vyznačajecca dla zapamohaŭ pajščykam padčas zabastovak, biezraboćcia i h. d. Kožny siabra kooperatyvy maje prava atrymać zapamohu z hetaha fondu.

Amal usie bujnyja kooperatyvy majuć ułasnyja damy, dzie kvatery vyznačajucca pajščykam na bolš lhotnych umovach, čym možna było-b dastać kvateru ŭ damaŭłaśnika-kapitalista. Bolšaj uvahi zasłuhoŭvaje budaŭnictva Hamburskaj kooperatyvy „Produktion", dzie isnuje asobnaje budaŭlanaje tavarystva vyklučna z pajščykaŭ kooperatyvy. Paj u hetym tavarystvie ŭstanoŭleny na 300 marak i ŭnosicca zvyčajnym u Niamieččynie sposabam—zatrymańniem premijaŭ za nabor. Tava-

---

nikaŭ novaha ładu śviet jašče viedaje mała. Ale i viedamaha chapaje, kab paćvierdzić jašče raz tuju praŭdu, što praca ludzkaja nikoli na marna jści nie pavinna, dy što kali jana nie apłačvajecca, dyk vina tut tolki ŭ papsutym mechaniźmie zamieny, u raspražeńni ziemlaroba z ramieśnikam i rabotnikam.—Sprehčy-ž ich možna tolki kooperatyŭnaja samapomač, ab čym hetak vymoŭna pavučaje tolki što apisany prykład amerykanski. Tam dzie z treskam valicca samabojčy kapitalizm, hdzie ni da čoha nie davodzić uzajemnaje pieralicytoŭvańnie ŭ palityčnym „radykaliźmie", tam rodzicca i ratuje ludziej kooperatyŭnaja samapomač. U hetym jejnaja vyžšaść nad usimi viedamymi haspadarča-hramadzkimi systemami, u hetym jaje siła i ŭ hetym zaruka jaje pieramohi.

A. K..

ца, дзе расла. Я ня з тых, што з сэрцам жартуюць.

Аляксей: Далёкія нашы дарогі, Настачка. Ты багатая, ня мной табе сьвет завязываць.

Насьця: Калі хочаш, то я выракуся свайго багацтва, пакіну дзеда, а з табой на край сьвету пайду, бо другога такога, як ты, няма на сьвеце. Чаго-ж ты баішся багацтва? Дзед з ахвотай цябе прыйме, а больш некаму перашкаджаць, я-ж сірата... А можа ты іншую маеш, толькі ня хочаш мне сказаць? — Скажы, Аляксейка! Я сьмерці сабе не зраблю, ані сьлёз ты маіх бачыць ня будзеш... Ой, я чую, што ты скрываешся перада мною, сказаць ня хочаш.

Аляксей: Калі ты хочаш ведаць, то табе скажу — ніколі я ня любіў больш нікога, як цябе і любіць ня буду.

Насьця (*прытуляецца*): Дык чаму-ж ты такі стаў? Хіба пачуў што ад людзей аба мне нядобрае? Думаю, што не.

Аляксей: Барані Божа! — А калі-б і пачуў, дык не паверыў-бы. Знаю цябе і ведаю, што ты не зьмянілася за гэныя тры гады. Але паслухай!... Да Вашага хутара трэба гаспадара, а не мяне. — Ты знаеш, да чаго мяне цягне, а як займуся гаспадаркай, ня будзе калі... А ўрэшце йшчэ нам, Настачка, людзі гадоў не рахуюць... Можа табе сьцюдзена, з рэчкі так холад цягне?...

Насьця: Не. Ты хочаш, каб я пайшла ад цябе? Надаела?

Аляксей: Не кажы гэтак! Ты адна, што мяне любіш і знаеш... (*Нясьмела*): Настачка, у мяне да цябе ёсьць справа.

Насьця (*скора*): Справа? Якая?

Аляксей: У нядзелю ў нас коопэратыўны сход.

Насьця: Я чула аб гэтым, а ты такі добры, што й не павядоміў мяне аб тым, што думаеце рабіць. Ня вераць мне...

Аляксей: Нялоўка было самому. Казаў я Рыгорку, каб цябе павядоміў. Замала ў нас ёсьць ахвотнікаў да гэтага. А што найгорш, — няма грашэй. Тут самым розумам і воляй нічога ня зробіш. На пачатак грошы трэба. Можа-б ты пазычыла?... Думаю, што дзед згодзіцца...

Насьця: Пабачым! Ня сама я гаспадыня, але ведаю, што дзед не адмове.

Аляксей: А прыйдзеш на сход? Прыйдзі абавязкава!

Насьця: А ты прыйдзі заўтра да нас! Прыхадзі часта. А як ня прыйдзеш, то ні на сход ня прыйду, ані грашэй не пазычу (*сьмяецца*).

Аляксей (*падумаўшы*): Прыйду, як сонца зайдзе за „дуб".

Насьця: Ага! Як сонца за „дуб" зайдзе! — Каб ты ведаў, Аляксейка, як цяжка

rystva maje ciapier až 160 vialikich damoŭ u Hamburzie i jaho vakolicach.

Mnohija kooperatyvy majuć „chaty-adpačynku“ dla dziaciej pajščykaŭ, kudy ich peryodyčna sklikajuć, čytajuć dakłady ab kooperacyi, arhanizujuć ekskursyi i h. d.

Znajomlučysia z pastanoŭkaju ŭsiej hetaj špravy mimavolna prychodzicca padziŭlać rezultaty asiahnienyja pracoŭnymi Niamieččyny vykłučna dziakujučy ichnaj enerhii, uporystaści i kooperatyŭnaj śviedamaści.

Było-b utopijaj z našaha boku łatucieć, kab u chutkim časie niešta padobnaje vyjaviłasia i ŭ nas i kooperacyja asiahnuła takuju roŭniu, jakuju jana asiahnuła ŭ Niamieččynie.

Adnak, šmat čaho možna było-b zapazyčyć i nam ad zachodnich kooperataraŭ. Biazumoŭna, nia prychodzicca nam łatucieć ab budovie kamianicaŭ, ale susim było-b mahčymaju takaja pastanoŭka spravy, kali-b i našyja kooperatyvy uśviadomili sabie nieabchodnaść i racyjanalnaść stvareńnia niekatorych fondaŭ, najbolš adpaviadajučych miajscovym varunkam.

(*d. b.*)

A. F.

Redakcyja „Samapomačy“ prosić usich, chto maje materyjały da historyi kooperacyi na Biełarusi, prysłać ich dziela vykarystańnia.

Kooperatyŭnyja naviny.

— Ličbovy stan ukrainskaj kooperacyi na 3 XII.31 h. pradstaŭlaŭsia hetaki: kredytowych kooperatyvaŭ — 362, spažyvieckich (haradzkich) — 135, sielska haspadarskich: — dla zakupu i zbytu — 2501, małačarskija rajonovyja - 99, inšyja vytvorčyja — 13, k-vy ramieśnikaŭ i rabotnikaŭ — 4, inšyja (pradpryjemčyja) — 47, pavietavyja sajuzy — 35, centrali — 4. Razam usich — 3.200

„Samapomač“ darma nie pasyłajecca: adnoviecie padpisku na 1933 hod!

— Ukrainskija kooperatyvy zažadali ad polskaha Uradu pakryćcia tych škodaŭ, jakija paciarpieła ukrainskaja kooperacyja pry h. zv. pacyfikacyi Uschodniaj Haliččyny ŭ 1930 h. Rachunak škodaŭ vynosić 152.510 złotych.

— Najbolšaj polskaj spažyvieckaj kooperatyvaj jošć k-va „Zgoda“ ŭ Paznani, jakaja ličyć 36 657 siabraŭ; złažyli jany 42.334 pai na sumu 1.270 020 zł. K-va „Zgoda“ maje 50 filijaŭ (adziełaŭ). Čystaha zysku za apošni haspadarčy hod heta k-va mieła 111.918 zł. 56 hr.

— Sajuz švedzkich kooperatyvaŭ abchodzić sioleta 25-cilećcie svajho isnavańnia. Hety sajuz, jak i cełaja švedzkaja kooperacyja cikavaja tym, što abymaje 200 miascovych žanočych hurtkoŭ z 8 000 siabroŭkami-kooperatarkami, zadańniem katorych jošć pieradusim pašyrać kooperatyŭnyja dumki siarod miascovych ludziej i namaŭlać ich stacca siabrami kooperatyvaŭ. — Pry miejscy treba ŭspomnić, što vartašć hetkaj pracy žančyn u kooperacyi całkom acanili ŭžo našy braty — ukraincy, jakija ŭvosieni letaś naładziŭšy byli dla žanok adnamiesiačny kooperatyŭny kurs. Hety kurs tryvaŭ da 19.XI.32 h. i končyli jaho 40 kursistak-ukrainak, pieravažna absolventak himnazijaŭ i vučycielskich seminaryjaŭ. — Ščaślivaj i płodnaj pracy!

мне адну хвіліну без цябе перабыць! Як вымучыў ты мяне за гэтыя тры гады і цяпер штось ходзіш задуманы. Ды знаю я цябе: „Багатырка, гаспадара трэба, да кніжак цябе рве, да працы ў народзе“. А са мною ў дастатках, ці-ж не лягчэй будзе табе жыць? Ці я табе не памагла-б. Ды ты-ж мяне выхаваў для сябе і дзеля гэтага, каб табе памагаць у народнай працы. Але ты ня хочаш чужым дабром багацець. — Вось што ты думаеш і як быццам ад мяне адхіляешся. Баішся людзкой гутаркі. — Ды не, я веру, што ты будзеш маім. Або твая, або нічыя! Гэтых маладых гадоў, што ў сонцы радасьці з табой правяла, я не падарую нікому. Ты мне сьвет адчыніў. Або ты, або ніхто!... Ну, бывай, Аляксейка, мне ўжо да хаты час.

Аляксей: Ня йдзі йшчэ, Настачка! Мне так добра з табой.

Насьця: Дык прыхадзі сюды часьцей. (*На адходзе*) Памятай: Або ты, або ніхто (*выходзе*).

Аляксей (*хвіліну глядзіць у сьлед за ёй, пасьля ідзе ў другую старану*).

ЗЬЯВА 6.

(*На сцэне нейкі час пуста. На двары штораз больш цямнее. Крэнчуць жабы. Гдзесь адазвалася сава. Зьмітрок, пасьля Янкель*).

Зьмітрок (*паднрадаецца з кіём*): Няма! (*Заглядае ў другі бок*): І тут няма. (*Прыглядаецца ўдаль*): Вось, здаецца ідзе. Дам я табе заляцацца! (*Хаваецца за капец і гатуецца „частаваць“ надходзячага палкай*).

Янкель (*падкрадаецца з другой стараны капца*): Няма! Ну?! (*Галасна кашляе*).

Зьмітрок (*выбягае з-за капца*): А, папаўся ты мне! (*Б'е палкай Янкеля*). Маеш, маеш!... (*Янкель хаваецца за капец*).

Янкель (*крычыць*): Ай-вай! Гевалт! Зьмітручок! Ды што робіш!

Зьмітрок (*прыглядаецца*): Ах, гэта вы, Янкель! А я думаў, што гэта гэны здыхляк — Аляксей.

Янкель (*ойкае*): Ой, але-ж вы мяне перапужалі. Калі-б за капец не схаваўся, то ўжо быў-бы труп.

Зьмітрок: Чаго-ж вы, пане Янкель, сюды зайшлі, ды яшчэ па ночы.

Янкель: Ну, як то чаго? Па вас, Зьмітручок. Ваш тата быў у мяне, ды й кажа: „Так і так — Зьмітрок, кажа, пагнаўся за Аляксеем, бо даведаўся, што ён з Насьцяю на сенажаці. (*Ойкае*): Ой баліць рука, бадай цябе, гэтак мяне сьпіразаў.

Зьмітрок: Перапрашаю вас, пане Янкель. Ну, памыліўся. Прапала. Цяпер ужо я яму дам і за сябе і за вас. Пайду па яго (*хоча йсьці*).

Янкель: Чакайце, мае даражэнькія. Я да вас маю гешэфт. Я дзеля гэтага сюды й прыйшоў.

Сельская гаспадарка.

Правілы аблічаньня

запасаў пашы і збожжа, якія ня могуць быць узяты за задаўненыя падаткі.

Віленская Скарбовая Палата (Izba Skarbowa) пісьмом з дня 22.XII.1932 г. № W. II. 11/33/419/32 выясьняе, што на выпадак забіраньня каму за задаўненыя падаткі пашы і збожжа, на абшары Віл. Скарбовай Палаты для пракармленьня гаспадарчай жывёлы і самых людзей на год будуць звальняцца ад забраньня наступныя колькасьці пашы і збожжа:

	Збожжа Кілё	Сена Кілё	Бульба Кілё
1. для раб. коняў і жарабят старэйшых двух гадоў	300	2.000	—
2. „ жарабят да двух гадоў	500	1.000	—
3. „ быдла стар. „ „	200	1.000	—
4. „ цялят да „ „	100	300	400
5. „ авечак на штуку . .	—	300	—
6. „ корм. сьвіней „ „ .	300	—	1.000
7. „ сьвіней надворных (кнуроў, паросных і падсьвінакаў) . . .	100	—	500
8. „ курэй і наагул дамовых птушак (на штуку) .	16	—	32

Салома азімая і яравая, кармовыя буракі, бручка і кармовая морхва сусём ня будуць забірацца. Пры недаборы сена, замяняецца яно аўсом і бульбай, лічачы за 1 кілё аўса 3 кілё сена або 5 кілё бульбы.

На пражыцьцё сям'і і службы гаспадара выпадае на год на асобу: збожжа (жыта, прыварак, крупы) 300 кілё і бульбы 800 кілё. Варыва не забіраецца.

На засеў аднаго гэктара пакідаецца: жыта, пшаніцы, аўса, ячменю, гароху, лубіну, бобу — 200 кілё, грэчкі — 100 кілё, лёну — 80 кілё, сэрадэлі — 50 кілё, мяшанкі на пашу —250 кілё, бульбы—2.000 кілё.

Гэтыя лічбы ў паасобных выпадках прысяжнымі знаўцамі могуць мяняцца. — Важна таксама і тое, што ўсе паданыя тут лічбы рахаваныя на год; гэта знача, што калі-б напрыклад сэквэстр адбываўся не за год да новага жніва, а за паўгоду, дык звольнена была-б ад сэквэстру толькі палова, а калі за 3 мес. да жніва, дык толькі адна чэцьверць паданага мноства пашных запасаў.

„Свая маці б'ючы не заб'е,
а чужая — гладзячы загладзіць".
(Бел. нар. прыказка).

Зьмітрок: Што такое кажаш?

Янкель: Ну, памалу, не сьпяшайся. Вось сядзем тут пад капец. Пагаворым. (*Зьмітрок сядае. Янкель прымасьціўшыся каля яго*): Я чуў, што Аляксей туды да Ахрэма, на хутар заглядае.

Зьмітрок (*гравіць палкай*): Некалі яго адтуль вывязуць фурай. Я яму йшчэ паламлю ногі. Я яму пакажу, што знача войтаў сын.

Янкель (*усьцішаючы*): Цс-цс-цс...Але-ж вы, Зьмітрок, заўзятыя. Агонь — не хлапец. Люблю такіх, ой, як люблю. Але вы, Зьмітрок, так не рабеце. Наб'іцё яго, або і сусём заб'іцё, а пасьля сьледзтва, суд, турма... Ня выпадае для войтавага сына.

Зьмітрок: Няхай будзе, што хоча. Я свайго не дарую. А і вам будзе лепш.

Янкель: Ой, каб ён прапаў той лайдак, той паскуднік, той вучоны пурыц... Але да яго ня так трэба брацца. Я вам, Зьмітручок, параджу так, што яго ня будзе, а вам волас з галавы не зьляціць. Ня ён вас, а вы яго ў турму пасадзіце. (*Устае, ідзе ў два бокі сцэны, глядзіць, а пасьля сядзе, нахіляецца да Зьмітрука і шэпча*): Трэба так зрабіць, каб ён апынуўся злодзеям.

Зьмітрок: (*не разумеючы*): Калі-ж ён ня п'е, ні ў карты ня гуляе. —

Янкель: Ну! Ці-ж гэта трэба піць гарэлку? Трэба ўночы забраць крыху з коопэратывы, а ён каб быў злодзеям.

Зьмітрок (*дагадаўся*): Ага! Так! Вось, гэта добра. Ха ха ха! Вельмі добра. Мы гэта патрапім. А я маю сваю хэўру...

Янкель: Нашто хэўра? Тут ня трэба хэўры. Вы з Максімам—вось і хэўра. Вы скажаце Максіму, каб ён прыйшоў да мяне. Разумееце? Абодва разам прыйдзеце.

Зьмітрок (*размысьляе*): Гм! Ага! Вось як. Эх, і розум у вас, пане Янкель. Ня дарма кажуць: жыдоўская галава. (*Праз хвілічу*): Добра. Я скажу Максіму і мы прыйдзем. (*Зрываецца*): Ну, час да дому. Пойдзем.

Янкель: Разам ня пойдзем. Яшчэ можа хто нас пабачыць. Вы ідзеце, Зьмітрок, а я пасьля. (*Зьмітрок выходзе*).

Янкель (*заціраe рукі і зларадасна сьмяецца*): Гэта гіт. Гэта гіт. А мы яго... у турму. Так, так, пане Аляксей. У турму. Хі хі хі! (*выходзе ціхачом*).

Заслона.

(д. б.)

Цяленьне кароў.

Беларускія земляробы шмат трацяць ад таго, што амаль 90% цяленьня прыпадае на адну і тую-ж пару году, на мясаед. Але тымчасам так ёсьць і з гэтым трэба рахавацца. Важна, каб высьцерагацца дальшых памылак.

Мамэнт цяленьня карову ў жывёлагадоўлі ня ёсьць нечым адарваным; ад яго залежа ўвесь дальшы лёс скаціны.

Карова целіцца звычайна на 285 дню (40—41 тыдзень), хоць часам пасьпяшыць (240 дзён), а часам і вельмі спозьніцца (310—320 дзён). Цялесная будова каровы вымагае адпачынку ў даеньні і дзеля таго яна мусіць абавязкава 6—8 тыдняў прад цяленьнем стаяць «суха». Нават г. зв. «добрыя» каровы, што самі не зарываюць, мусяць быць да гэтага змушаны: не даваць ім млекагоннай пашы буракоў, вотрубаў, усялякай сіляжы і г. д. і выкідаць памалу спачатку дзеннае даеньне, а пасьля ўсё астатняе. Адпачынак прад цяленьнем карове гэтаксама патрэбны, як чалавеку штодзенны сон: пры незахоўваньні гэтага адпачынку нішчыцца здароўе, а з ім і ўсякая карысьць.

Самае цяленьне нармальна ня трывае даўжэй паўгадзіны. Помач людзкая пры гэтым патрэбна толькі ў паадзіночных выпадках, ды і то важна, каб з ёю занадта не пасьпяшыцца: аж покуль не адойдуць гэтак званыя пладовыя воды.

Найчасьцейшай прычынай усякіх забурэньняў пры цяленьні ёсьць няправільнае палажэньне цяляці. За правільнае-ж палажэньне ўважаецца такое, калі цялё выходзіць галавой выцягненай наперад і ўніз і зложанай на выцягненых таксама ўперад пярэдніх ножках. Усякае іншае палажэньне цяляці пры цяленьні ёсьць няправільным і да направы яго зараз-жа трэба клікаць асобу ў гадоўлі дазнаную, звычайна дохтараветэрынара.

Пры правільным палажэньні цяляці можна памагчы карове толькі тым, што двух-трох мужчын бяруць рукамі цялё за пярэднія ножкі і цягнуць. Пры гэтым — увага! Ня можна цягнуць стала, бязупынку, а толькі ў такт з высіляньнем (напінаньнем) самой целячайся каровы. Больш нічога.

Пасьля сьцяленьня карова звычайна бывае вельмі змучанай і яе найлепш цяпер прыкрыць нейкай гунькай і на час якісь пакінуць у супакоі. Калі-ж карова ачуняецца, дык трэба даць ёй *цёплае* пойла, найлепш — з вотрубамі. Інакш з прыкормліваньнем ня трэба сьпяшацца, ды і наагул ня можна ацеленай карове *вразу* даваць шмат і сільнага корму, прывучаць яе да гэтага трэба толькі памалу, кожны дзень больш. Добрае мурожнае сена з вотрубным пойлам — найлепшы корм для сьвежа ацеленай каровы.

Па цяленьні, да 3-ох, найпазьней да 8-ох дзён мусіць настаць шчышчэньне каровы, выдаленьне пладовага лагва. Калі-б гэта чамусьці ў пару ня сталася, лагво пачынае ўсярэдзіне раскладацца, гніць, што навонкі паказваецца „белатокам". Затрыманае ўсярэдзіне радзільнае лагво загніваецца, а ад гэтага затруваецца кроў і жывіна гіне.

Найпрасьцейшай помаччу пры выдабыцьці лагва ёсьць „клістыр", або леватыва: у радзільныя органы ўліваецца пару літраў цёплай вады, у каторай дзеля дэзынфэкцыі распушчана 1—2% крэгліну або лізолю. Калі лагво было толькі прысохшы, а ня зросшыся з нутранымі ворганамі, дык яно адмакае і выходзіць. Каліж-бы гэта ня сталася, адратаваць жывіну зможа толькі с к о р а я дахторская помач.

Даіць карову раней як за тры гадзіны па цяленьні ня можна з увагі на самую карову і на цялё. Тут-жа трэба адцеміць шкоднасьць звычаю „адкраданьня" малака ад цяляці. Цялё родзіцца з жалудкам напоўненым кашавітай г. зв. смолкай, якую трэба стуль насамперш выдаліць, каб апаражніць мейсца для прыняцьця корму, для малака. І для гэтага быццам разслабленьня жывата новароджанага цяляці служа малозіва. Яно мае ў сабе гэтак званае „колёструм", якое дзеіць на цялё падобна, як рыцына на чалавека. Вось-жа дзеля гэтага тыя гаспадыні, што „адкрадаюць" малозіва ад цяляці, гэтым самым не пазваляюць яму як трэба прачысьціцца і здарова пачаць жыцьцё, а знача — яму шкодзяць.

Затое, апрача першага дня, трэба карову заўсяды да чыста выдойваць пасьля ссаньня. Гэтага вымагае здароўе каровы і нармальная праца малакотворчых гручолаў: і адно і другое ёсьць у інтарэсе кожнага гаспадара земляроба. Дык няхай-жа памылкі не паўтараюцца. Малозіва ў першую чаргу належыць цяляці: і як корм і як лякарства.

інж.-агр. А. К.



БЕЛАРУСКІЯ ГАСПАДАРЫ! Памажэце як можаце гібеючай ад голаду і холаду дзікой птушцы, а яна Вам адудзячыцца ўлетку зьбіраньнем і нішчэньнем мух, жукоў, рабакоў і інш. шкоднай для земляроба жамяры!



Redaktar-Vydaviec inž. A. KLIMOVIČ.

Bielaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 6—10.

Як выбраць з лубіну ягоную горыч?

Зярняты лубіну маюць шмат бялкоў і таму яны вельмі пажыўныя для гаспадарскай жывіны. Адна бяда толькі, што гэтыя зярняты горкія. Каб выбраць гэту горыч, людзі стасуюць усялякія спосабы. Апошнім часам у фаховай земляробскай літэратуры знаходзім яшчэ адзін гэтакі спосаб, які тут і разгледзім.

Лубін празначаны да адгарчэньня насыпаюць у дзераўляную судзіну, напр. у бочку і заліваюць на пару (суткі) мяккай вадой, каб набрак. Тады ваду спушчаюць, а набраклы лубін або параць у парніку праз гадзіну, або, калі парніка няма, вараць у катле праз паўтары гадзіны часу. Пасьля распараны ці развараны лубін прамываюць чыстай вадой. Налепш рабіць гэта апошняе ў праточнай вадзе, куды завешваюць плецяныя кашы з параным ці вараным лубінам на дзьве пары (двое сутак), а то і на даўжэй, покуль гэткае зерне лубіну раскушанае ня мае ўжо горычы. Калі-б гдзе праточнай вады ня было, тады параны ці вараны лубін накладаецца ў дзераўляную бочку, пастаўненую на крыжакох і заліваецца чыстай вадой праз дзьве пары, штодзень двойчы мяняючы гэту ваду. Гэтак выпаласківаецца з лубіну самая толькі горыч, а бялок, будучы зваранымм, гэтаму выпаласківаньню не паддаецца і астаецца ў зярняці як пажыва.

Жывіна ня зразу есьць лубін, бо мусіць да яго прывыкнуць. Большая колькасьць лубіну для дойных кароў ад'емна ўплывае на якасьць малака, і ўсякіх з яго вырабаў, перадусім сыру, а таксама і масла. Дзеля гэтага дойнай карове ня можна даваць лубіну больш як паўтара кілё ўдзень, а кормнай можна даваць і 3 кілё; сьвіням даюць лубіну 1/4 да 1/2 кілё на штуку і дзень. Маецца пры гэтым наўвеце вага сухога лубіну. — Каб жывіна лепш пeражоўвала і травіла лубін, радзяць даваць яго зьмяшаным з сухой сечкай: адна часьць лубіну на дзьве часьці сечкі. — Пры канцы трэба зазначыць, што бялок з адгорчанага лубіну ёсьць адным з найтанейшых кармавін наагул.

Haspadarčaja chronika.

— Ad 1.I.33 h. Niamiečyyna zabaraniła ŭvozić kruhłaje dreva z Polščy.

— Na Vilenskim rybnym rynku jašče prad Kaladnymi śviatkami źjaviłasia savieckaja ryba (bo miajscovym kupcam sekvestratary zabrali rybu za padatki). Ciapierža, paśla zaćvierdžańnia polska-savieckaj umovy ab nienapadańni i paśla prajektavańnia ŭ Vilni Addziełu Savieckaha handlovaha pradstaŭnictva, tutejšy rynak jašče bolš budzie chiba-ž zakidyvacca tavarami savieckimi, na škodu miascovych kołaŭ haspadarčych i handlovych.

— Na haspadarča-pramysłovaj kanferencyi ŭ Vilni dn. 21.XII. 32 h. pradstaŭnik młynarskaha promysłu vyjaśniŭ, što ŭčaście miascovaha ziemlarobstva ŭ zaaprovijantavańni Vilni vielmi małoje. Siudy pryvozicca šmat peramołataha zbožža z Polščy. — Vynikaje z hetaha, što davoz polskaha zbožža bje pa našym ziemlarobstvie, bo abnižaje ceny na jahonyja pradukty. Niavyhodny hety davoz i dla miascovaha młynarskaha promysłu, bo pryvoz na tutejšy rynak čužoha pieramołataha zbožža rodzić biezraboćcie ŭ tutejšych młynoch. Słovam, haspadarčaje „žanimstva" Vilni z Polščaj dla nas niavyhadna.

— Ad dnia 31.XII 32 h. na cełym dziaržaŭnym abšary Polščy zabaroniena brać ad pazyčak bolšy pracent jak 12.

— Dn. 22.I.33 h. ŭ Vilni ŭračysta adčyniena zbažžova-tavarnaja i lnianaja bursa (giełda). — Staršynioj bursy jość L. Chaminski.

— Ministerskaja Rada (polskaja) pryniała anahdaj pastanovu ab skasavańni pazyčak uziatych na adbudovu, kali heta pazyka nia bolšaja tysiačy załatovak. Chto z hetaj pastanovy najbolš skarystaje?

Ziemlarobski tydzień u Prazie (Č.S.R.) sialeta naznačany na čas ad 19 da 26 lutaha i maje zajmacca pieradusim pytańniami: 1. mahčymaściaŭ abličeńnia koštaŭ vytvorstva ŭ ziemlarobstvie; 2. suadnosin koštaŭ vytvorstva da čystaha zysku, 3. mahčymaści abnižeńnia koštaŭ ručnoj i zaprežnaj pracy ŭ canie samych praduktaŭ, a 4. taksama vahańnia cenaŭ, pokul ich naahuł mahčyma pradbačyć.

CENY Ŭ VILNI:

ZBOŽŽA (hurtam, za 100 klh. — 6 pudoŭ): žyta — 16.50—16.75, pšanica — 26.00—27.00, žytnija votruby — 9.00—9.50, pšaničnyja votruby — 10.50, jačmień na pansak — 13.50—14.00, avios — 12.00—13.00, makuchi lnianyja — 21.00 makuchi z słanečniku 17.00, kaniušyna čyrvonaja — 90.000—100.00, kaniušyna biełaja — 100.00 — 120.00.

MAŁOČNYJA VYRABY: masła najlepšaje 1 kilo hurtam 2.70—2.80, u detalu 3.00—3.10, masła stałovaje za 1 kilo hurtam 2.50—2.60, u detalu 2.80; syr litoŭski — za 1 kilo hurtam 2.00—2.60, u detalu 2.40—2.80; jajki za kapu — 6.60—8.40, za štuku 12—16 hrašoŭ.


MIASA NA HARADZKOJ BOJNI: 1. Skacina za 1 kilo žyvoj vahi—0.70—0.80 zł. 2. Śvińni—0.90—1.10 zł.

HROŠY: 4.I.33 h. za 1 amer. dalar płacili 8 zł. 92 hr. za 1 załaty rubiel — 4 zł. 67 hr.

Паштовая скрынка.

Беларуска-Амэрыканскаму Саюзу ў Чыкаго: часопісь пасылаем і чакаем падпіскі; Інж. А. Шаху у Чэхаславаччыне: — усё атрымалі, дзякуем, просьбу выканаем; такіх-бы супрацоўнікаў нам больш, дык „Самапомач", а з ёй і беларуская коопэрацыя разьвівалася-б нястрыманым ходам; Ян-Сону(?) — атрымалі, дзякуем, згода, наша думка(!), зьмясьціць у гэтым № 1 (4) ўжо ня можам, бо запоўна прышла, рэшта ў асабістым пісьме за тыдзень; Ярмалковічу — атрымалі, дзякуем, пры магчымасьці выкарыстаем; Інж. М, Г—цы — як-жа справа йдзе далей?; Бел. Дабрадзейнаму Т-ву ў Стаўпцох — нехапаючыя нумары высланы. Ад гэтага нумару будзем пасылаць па два экзэмпляры; Фр. Макарэвічу — будзем пасылаць і верым, што датрымаеце слова; Бол. Баркоўскаму — спачуваем Вам у крыўдзе, але „Самапомач" ня мае з гэнымі людзьмі нічога супольнага. Абяцаць Вам пасады ня можам, бо гэткіх, як Ваш выпадак, ёсьць у нас дзесяткі; але цікаўцеся коопэрацыяй далей, прыдасца: гэта напэўна. Будзем мець Вас на воку. Пашырайце „Самапомач". Сьлёзьніку — Ваша справа аддана ў рэд. Б. Крыніцы", праверана і папраўлена; падпіску атрымалі дзякуем; Легезе П., Лотышу Я., Худніцкаму В. і Туронку Яну: — просьба выканана, чакаем падпіскі. Дру Грынкевічу — атрымалі, дзякуем, просьба выканана. Гуртку БІГІК ў Шальцінiх: атрымалі, дзякуем, выканалі, шчасьліва працуйце!

Pierasylka apłačana ryčałtam.



CANA NUMARU 40 HRAŠOŬ

